Пасяджэнне Міжведамаснай рабочай групы па падрыхтоўцы да Сусветнай канферэнцыі радыёсувязі 2023 года

18 лютага 2020 г. пад старшынствам Першага намесніка Міністра сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь Несцяровіча С.А. адбылося першае пасяджэнне Міжведамаснай рабочай групы (МРГ) па падрыхтоўцы да Сусветнай канферэнцыі радыёсувязі 2023 года (СКР-23), у якім прынялі ўдзел прадстаўнікі Міністэрства сувязі і інфарматызацыі, РУП «БелДІЭ», а таксама радыёчастотных органаў ведамстваў і арганізацый - карыстальнікаў радыёчастотнага спектру. Цэнтрам кампетэнцыі па падрыхтоўцы СКР-23 выступае РУП «БелДІЭ».

На пасяджэнні вызначаны прыярытэтныя для Рэспублікі Беларусь пункты парадку дня СКР-23, замацаваны пункты парадку дня СКР-23 за зацікаўленымі ведамствамі, адобраны праект плану работы МРГ па падрыхтоўцы да СКР-23.

Сусветныя канферэнцыі радыёсувязі (СКР) праводзяцца кожныя тры-чатыры гады. У Задачу СКР ўваходзіць аналіз і, у выпадку неабходнасці, перагляд Рэгламенту радыёсувязі , міжнароднага дагавора, які рэгулюе выкарыстанне радыёчастотнага спектру, а таксама геастацыянарнай і негеастацыянарнай спадарожнікавых арбіт. Перагляды ажыццяўляюцца на аснове парадку дня, які вызначаецца Саветам МСЭ , які ўлічвае рэкамендацыі папярэдніх сусветных канферэнцый радыёсувязі.

Папярэдні парадак дня сусветных канферэнцый радыёсувязі устанаўліваецца загадзя за чатыры-шэсць гадоў, а канчатковы парадак дня устанаўліваецца Саветам МСЭ за два гады да канферэнцыі са згоды большасці Дзяржаў-Членаў.

Source URL: *https://www.mpt.gov.by/news/19-02-2020-5964*